# ДУХОЎНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСАЎ: ПОСТАЦІ ПАДЗВІЖНІКАЎ XX СТАГОДДЗЯ
# SPIRITUAL CULTURE OF BELARUS: THE ASCETIC FIGURE OF THE XX CENTURY

Алена Муравіцкая,
Мінск, Беларусь

Ключевые слова: духовная культура, подвижники, святые, праведность, духовность, нравственное совершенство, духовное наследие.

Резюме. Рассмотрена подвижническая жизнь трех белорусских святых, чьи личности явились воплощением лучших черт белорусского народа, его духовной культуры, примером самоотверженного служения своему народу.

Keywords: spiritual culture, ascetics, saints, righteous, spiritual, moral perfection, spiritual heritage.

Summary. Here are considered the ascetic life of three Belarusian saints, whose personalities were the embodiment of the best features of the Belarusian people, their spiritual culture, an example of selfless service to their people.

Духоўная культура народа найбольш ярка ўвасоблена ў постацях яго лепшых дачок і сыноў. Сярод іх ёсць такія, хто ўпрыгожыў беларускую зямлю высокімі духоўнымі і маральнымі подзвігамі, хто з’яўляецца сімвалам праведнасці, шчырай набожнасці, высокай духоўнасці, узорам самаадданага служэння свайму народу. Чым больш часу аддзяляе нас ад перыяду іх зямнога жыцця, тым болей мы пераконваемся ў іх неўміручасці, знаходзім для сябе апору ў іх духоўнай спадчыне.

Сярод падзвіжнікаў беларускай зямлі – вядомыя асветнікі, высокаадукаваныя людзі, а таксама тыя, хто вядомы сваім свяціцельскім служэннем, прападобныя і блажэнныя, якія праззялі сваімі духоўна-маральнымі подзвігамі на тэрыторыі Беларусі і за яе межамі, шчырыя вернікі і абаронцы праваслаўнай веры. Пра кожнага з такіх светачаў духоўнай культуры можна гаварыць асобна і доўга. Мы б хацелі зараз успомніць толькі трох нашых суайчыннікаў, якія жылі зусім нядаўна і духоўна ўзбагацілі нашу культуру сваім падзвіжніцкім жыццём. Гаворка пойдзе пра святога праведнага Іаана Кармянскага, прападобную Манефу Гомельскую і блажэнную Валянціну Мінскую. Усе яны жылі ў XX стагоддзі і праваслаўнай царквой праслаўлены ў ліку святых.

Святы праведны Іаан Кармянскі ( Гашкевіч) нарадзіўся ў 1837 годзе ў вёсцы Агароднія на Гомельшчыне. Яго бацька служыў свяшчэннікам у мясцовым храме ў імя свяціцеля Мікалая. Пачатковую адукацыю Іаан атрымаў у царкоўнапрыходскай школе, затым скончыў гімназію і духоўную семінарыю. Пасля смерці бацькі ён стаў настаяцелем царквы ў роднай вёсцы. У канцы 1876 года ва ўзросце 39 гадоў айцец Іаан быў пераведзены ў вёску Агароднія Гомельскага павета, дзе стаў настаяцелем мясцовай царквы. Храм у гонар свяціцеля Мікалая ў вёсцы Агароднія стаў месцам узмоцненага малітоўнага подзвігу святога. На новым прыходзе бацюшка прыклаў шмат намаганняў для наладжвання прыходскага жыцця і добраўпарадкавання

храма. Неўзабаве айцец Іаан наведаў Кіева-Пячэрскую лаўру, дзе атрымаў ад старцаў благаславенне весці строгі аскетычны лад жыцця. Бацюшка да самай смерці не ўжываў мясной ежы і трымаў строгі пост у сераду і пятніцу, ночы праводзіў у малітве. На богаслужэнне да яго прыходзілі людзі з суседніх паселішчаў, каб наталіцца благадаццю ад сумеснай малітвы з “пастырам добрым”. Любоў да бліжняга, якую прапаведаваў, айцец Іаан пацвярждаў канкрэтнымі справамі, часта паўтараючы словы апостала Іакава: “ Вера без спраў мёртвая” (Іак. 2, 20). У Агародні і ваколіцах людзі памятаюць і перадаюць з пакалення ў пакаленне гісторыі, якія сведчаць пра надзвычайную дабрыню, міласэрнасць і празорлівасць свайго пастыра. Айцец Іаан лячыў людзей без грошай, вымольваў ацаленне нават беснаватым. У час Першай Сусветнай вайны бацюшка клапаціўся пра абяздоленых, з беднымі дзяліўся апошнім, дапамагаў сіратам і шматдзетным сем’ям.

Пасля адыходу да Госпада праведнік не пакінуў сваіх духоўных дзяцей. Людзі прыходзілі на яго магілу, дзе таксама адбываліся ацаленні. У 1956 годзе храм Божы, дзе служыў айцец Іаан, быў спалены, а могілкі, дзе ен быў пахаваны разам з сынам, таксама святарам, зруйнаваныя. На месцы храма зрабілі клуб. Але людзі прыходзілі на гэта святое месца і атрымоўвалі па сіле сваёй веры шматлікія ацаленні. У 1997 годзе былі знойдзены святыя мошчы заступніка зямлі Беларускай – айца Іаана Гашкевіча.Зараз мошчы святога знаходзяцца ў Свята-Пакроўскім храме вёскі Карма Добрушскага раёна Гомельскай вобласці. Сёння вёска Карма стала месцам паломніцтва вернікаў з Беларусі і суседніх краін. Цэрквы ў гонар праведнага Іаана Кармянскага дзейнічаюць у Гомелі, вёсках Глінянкі і Малыя Лётцы Віцебскага раёнаў. Памяць святога праведнага Іаана Кармянскага адзначаецца 31 мая і 9 верасня. Іконы праведнага Іаана Кармянскага з 1998 года знаходзяцца ў многіх праваслаўных храмах Беларусі.

Другая падзвіжніца ХХ ст. схіманахіня Манефа (Марыя Скапічова) нарадзілася 1 красавіка 1918 года ў вёсцы Сеўрукі на Гомельшчыне. З дзяцінства пакутуючы ад невылечнай хваробы, Марыя не магла хадзіць. Аднак яна несла свой жыццёвы крыж з цярпеннем, пакорнасцю, любоўю да Госпада і людзей. Яе духоўнае ўзрастанне адбывалася ў атмасферы дамашняй малітвы. Часта яна наведвала і храм былога Чонкаўскага жаночага манастыра ў гонар Ціхвінскай іконы Божае Маці. У 1942 годзе ў адноўленым манастыры Марыя прыняла манашаскі пострыг. Але ўжо ў верасні 1943 года ў ходзе карнай акупацыі акупантаў  манастыр быў спалены, а манахіні разагнаны. Прападобная вярнулася ў бацькоўскую хату і там працягвала свой малітоўны подзвіг. Начнымі малітвамі яна вымольвала ацаленне хворым, брала іх боль на сябе, сама пакутуючы ад бясконцых хвароб. Дабрыня матушкі прыцягвала да яе не толькі аднавяскоўцаў, але і людзей здалёк. Галоўная яе парада людзям – імкнуцца да пакаяння, міласэрнасці і малітвы. Выбранніца Божая матушка Манефа была надзелена вялікім дарам малітвы, празарлівасці і ацалення людскіх немачаў.

25 лютага 1984 года матушка Манефа адышла да Госпада. На пахаванне схіманахіні прыехалі ўсе, хто ведаў і любіў яе як малітвенніцу і духоўную маці. 11 жніўня 2006 года адбылося аднойдзенне пачэсных мошчаў святой схіманахіні Манефы, а 20 верасня таго ж года мошчы былі пакладзены ў спецыяльную раку. 11 жніўня 2007 года ў Гомелі адбылося царкоўнае праслаўленне прападобнай Манефы. Яе святыя мошчы, якія славяцца дарам дабрадатнай дапамогі і ацаленнямі, спачываюць у Гомельскім Петра-Паўлаўскім кафедральным саборы. У гонар прападобнай Манефы асвячоны храм у вёсцы Сеўрукі Гомельскага раёна.

Духоўная заступніца зямлі Мінскай – так найчасцей называюць яшчэ адну падзвіжніцу XX стагоддзя –святую блажэнную Валянціну Мінскую. Нарадзілася блажэнная Валянціна 7 красавіка 1888 года ў сям’і свяшчэнніка, настаяцеля Мікалаеўскага храма сяла Станькава Мінскага павета протаіерэя Федара Чарняўскага. Атрымаўшы хрысціянскае выхаванне і адукацыю ў Мінскім жаночым духоўным вучылішчы, Валянціна рыхтавала сябе да педагагічна-асветніцкай дзейнасці.Аднак Першая сусветная вайна і рэвалюцыя парушылі мірны ход жыцця. У хуткім часе шквал ганенняў абрынуўся на Царкву, закрануўшы сем’і свяшчэннаслужыцеляў і актыўных вернікаў. Святарскія сем’і абкладаліся непасільным падаткам, іх пазбаўлялі харчовых картак, жылля, прымушалі дзяцей публічна адракацца ад веры і ад сваіх бацькоў. У пачатку 1930-х гадоў муж Валянціны Федар Сулкоўскі, чыноўнік ваеннага ведамства, быў арыштаваны і высланы ў лагер, дзе і загінуў у 1933 годзе. Мучаніцкую смерць ад бязбожнай улады прынялі і мужы Ксеніі і Ганны, родных сясцёр Валянціны.

Цяжкія жыццёвыя абставіны, перажытыя Валянцінай з вялікім душэўным болем, сталі гарнілам выпрабаванняў, у якім яна ўмацоўвалася духам. У пачатку 1930-х гадоў Валянціна аказалася прыкаванай да ложка цяжкай цялеснай немаччу. Пасля смерці ў 1937 годзе маці – Сафіі Чарняўскай, яна засталася адна. На той час былі пазакрываны ўсе цэрквы Мінскай епархіі, замерла царкоўнае жыцце. І вось у гэтых цяжкіх абставінах Гасподзь зрабіў блажэнную Валянціну Сваею выбранніцай, каб несці асаблівы малітоўны подзвіг і сведчыць, што “сіла Божая ў немачы здзяйсняецца” (2 Кар. 12, 9). Цялесная немач была ўспрынята ёю як заклік Госпада выконваць апостальскае настаўленне “ …узносіць малітвы, прашэнні, маленні, падзякі за ўсіх людзей…” (1 Цім.2, 1). Блажэнная Валянціна была адной з тых нямногіх, хто ў суровыя часы атэізму заставаўся верным Хрысту і Яго Царкве. У цяжкія часы агульнага бязвер’я, калі Царкву гналі і храмы разбуралі, яна захоўвала ў сваёй душы неацэнны скарб веры, памнажала яго, перадаючы людзям і запальваючы іх сэрцы любоўю Божай. Разам з асаблівым дарам малітвы Гасподзь дараваў ей здольнасць бачыць будучыню і духоўна выпраўляць людзей, а таксама ацаляць іх цялесныя хваробы.

Да ляжачай старыцы неслі хворых дзяцей, прасілі памаліцца, прыходзілі за жыццёвымі і духоўнымі парадамі. Сваім прасветленым унутраным зрокам святая бачыла свет з духоўнага, нябачнага для большасці

людзей боку – духам спазнавала жыццё людзей, не пытаючыся, хто і дзеля чаго прыйшоў, давала адказы на затоенныя пытанні. Гэтым яна сцвярджала ў людзях веру ў Госпада і ў Промысел Божы адносна кожнага чалавека. Матушка Валянціна суцяшала гаротных, разгубленых у жыццёвых абставінах, па яе малітвах Гасподзь вяртаў здароў'е безнадзейна хворым людзям. Асабліва многа людзей звярталася да матушкі ў час вайны. Звычайна яе словы і павучанні мелі форму іншасказанняў, прытчаў, яны былі зразумелыя толькі таму, на чыё ўнутранае пытанне яна адказвала. Матушка мела ад Госпада дар прадбачыць мінулае і будучае і, калі лічыла неабходным, абвяшчала гэта людзям. Судакранаючыся з чужым горам, яна імкнулася прышчапіць чалавеку духоўны навык спадзявання на міласэрнасць Божую, на дапамогу Яго Прачыстай Маці і заступніцтва святых угоднікаў Божых.

Блажэнная Валянціна была не толькі змірэннай малітоўніцай, але часам і праведнай выкрывальніцай. Нярэдка пад поглядам яе вачэй людзі ўсведамлялі сваю грахоўнасць і станавіліся на шлях пакаяння. Больш за трыццаць год праляжала Валянціна ў цялеснай немачы. Гасподзь не пакінуў яе ў бядзе, паслаўшы добрых людзей, якія дапамагалі ёй пераадольваць жыццевыя нягоды.

Глыбокай, шчырай любоўю і павагай да матушкі Валянціны напоўнены ўспаміны яе землякоў і аднавяскоўцаў, якія дагэтуль удзячна расказваюць пра многія выпадкі цудоўнай дапамогі па малітвах святой, сведкамі і ўдзельнікамі якіх яны былі ў розны час. У гэтых сведчаннях вобраз блажэннай яскрава раскрываецца перад намі ў сваей паўнаце і духоўнай прыгажосці.

Матушка Валянціна запомнілася сучаснікам як чалавек незвычайнай духоўнасці, дабрыні і спагады, глыбокай засяроджанасці ў малітве. Усе, хто сустракаўся, перажыў дабрадатную дапамогу, аказаную Госпадам па малітвах матушкі, нягледзячы на даўнасць часу і сення напоўнены глыбокай пашаны да памяці блажэннай.

Спачыла матушка Валянціна  6 лютага 1966 года. Пахавалі яе на вясковых могілках вескі Крысава Дзяржынскага раёна  Мінскай вобласці. І пасля спачыну святая не пакідала сваім заступніцтвам тых, хто прыходзіў да яе сціплай магілкі, якая стала для многіх месцам паломніцтва і гарачай малітвы.

Глыбокае народнае ўшанаванне Божай угодніцы асабліва ярка праявілася ў 1990-я гады, калі паломніцтвы да месца яе спачыну набылі масавы характар, а мясцовае духавенства стала рэгулярна здзяйсняць паніхіды на яе магіле. Роўна праз сорак гадоў пасля яе спачыну, 6 лютага 2006 года, у Мінскім Свята-Духавым кафедральным саборы адбыўся чын праслаўлення святой Валянціны Мінскай і далучэнне яе да Сабору Беларускіх святых. З тых часоў у гэты дзень штогод у храмах Беларускай Праваслаўнай Царквы адбываюцца ўрачыстыя богаслужэнні, здзяйсняюцца шматлікія паломніцтвы да месца спачыну святой. У 2007 годзе на яе магіле

ўстаноўлены дубовы крыж з надпісам “Блажэнная Валянціна Мінская, малі Бога за нас”.

Сотні гадоў аддзяляюць нас ад першых часоў хрысціянства на беларускіх землях. Іншы раз нам здаецца, што святых добрапамысных людзей немагчыма сустрэць у сённяшнім мітуслівым жыцці. Аднак жыццёвы подзвіг нашых вышэйназваных суайчыннікаў сведчыць, што беларуская зямля працягвае нараджаць падзвіжнікаў, якія ўзбагачаюць духоўную культуру народа і ўшаноўваюцца нашым народам як заступнікі за нас і нашу Бацькаўшчыну.

Літаратура


1. Блажэнная Валянціна, духоўная заступніца зямлі Мінскай. Уклад. прот. Віктар Перагудаў. – Мн.: Прыход Свята-Петрапаўлаўскага сабора, 2018. –20 с.
2. Палачанін Федар. Святло сярод ночы. Асновы праваслаўнай веры  – Мінск, 2018. – 196 с.
3. Святыя зямлі беларускай. Жыццеапісанні. Уклад. Л.Я.Кулажанка, Т.А.Матрунчык . – Мінск, 2012. –184 с.